# Школьная планета

НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!

№ 5 (61) СТУДЗЕНЬ 2020

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*



## Віншуем

**ВІКТОРЫЮ ЛАПЦЁНАК,**
вучаніцу 11 "А" класа -
уладальніцу дыплома III ступені
III этапа рэспубліканскай
алімпіяды
па вучэбных прадметах
"руская мова і літаратура"
і яе кіраўніка
Ніну Васільеўну
Бярнацкую

Інтэрв'ю з прызёрам чытайце на ст. 2



Матэрыял чытайце на ст.5

## У полі зроку: ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

**Дом, у якім утульна ўсім!**
**berezino2.school.by** *№ 5 (61) студзень 2020 г.*



# "Вучыцеся і не бойцеся памыляцца!"

У нашай школе даволі шмат выдатных вучняў, якія ўдзельнічаюць у розных алімпіядах і займаюць прызавыя месцы. Аднак алімпіяда і падрыхтоўка да яе – гэта вельмі хвалюючая падзея, якая патрабуе шмат часу, сіл і нерваў. Вучаніца 11 класа нашай установы адукацыі Вікторыя Лапцёнак пераадолела цяжкі этап падрыхтоўкі і паказала выдатны вынік на абласным этапе алімпіяды па рускай мове і літаратуры. Думаю, многім, ды і мне самой, як актыўнаму ўдзельніку алімпіяд, было б цікава даведацца, які кошт прызнання і месца на п’едэстале гонару.

**-Вікторыя, віншую цябе з прызавым месцам на алімпіядзе. Ты стала ўладальніцай дыплома 3 ступені трэцяга этапа алімпіяды па вучэбным прадмеце «руская мова і літаратура». Упэўнена, што, каб заняць высокае месца, трэба штодзень вельмі шмат займацца. Колькі прыкладна гадзін у тыдзень у цябе заняла падрыхтоўка?**

**Віка**: Дзякуй за віншаванне. Сапраўды, спатрэбіўся час і жаданне ўпарта працаваць. Я займалася гадзіны па 4-5 кожны будні дзень і гадзіны 3 у суботу. У суме атрымліваецца дзесьці 28 гадзін у тыдзень.

**- Ведаю, ты сапраўды прыклала шмат намаганняў. Ці разлічвала, што зоймеш такое высокае месца? Ці для цябе гэта стала нечаканасцю?**

**Віка**: Я разлічвала ўвайсці ў дзясятку, так што вялікай нечаканасцю для мяне гэта не было.

**- Неад'емная частка любога конкурсу або алімпіяды - гэта хваляванне. Калі ты хвалявалася больш за ўсё: у час падрыхтоўкі, самой алімпіяды ці перад абвяшчэннем вынікаў?**

**Віка**: Больш за ўсё я хвалявалася перад абвяшчэннем вынікаў, таму што нам звычайна казалі іх у той жа дзень, калі мы і выконвалі алімпіядныя заданні, а ў гэты раз прыйшлося пачакаць да наступнага дня. Гэта значыць, ты ўжо напісаў усё, прыкладна ведаеш свой вынік, але ўсё роўна хвалюешся. Думаеш: "хутчэй бы ўжо даведацца".

**– Цалкам з табой згодна. Доўгае чаканне вынікаў і пастаяннае пракручванне ў галаве сваіх магчымых памылак - адзін з самых хвалюючых момантаў. У дрэнным сэнсе. Ацані гэта хваляванне па шкале ад 1 да 10.**

**Віка**: На васьмёрачку.

**– Наколькі абласны этап быў складаней, чым іншыя, па тваіх адчуваннях?**

**Віка**: Не скажу, што ён быў самым складаным выпрабаваннем у маім жыцці, але сапраўды, раённы этап быў лягчэй, чым абласны. Проста для мяне гэта быў час, хутчэй за ўсё, атрымання новага вопыта.

**- Ты лічыш, што зараз дасягнула свайго максімуму, ці што ты змагла б напісаць яшчэ лепш, калі б прыняла ўдзел яшчэ раз?**

**Віка**: Водгук я б, напэўна, напісала сапраўды гэтак жа. Ён у мяне атрымаўся вельмі добрым. А комплексную працу я б змагла напісаць значна лепш. Тады на мяне вельмі моцна паўплывала хваляванне, з-за чаго я здзейсніла некалькі недарэчных памылак.

**- І напрыканцы. Дай невялікую параду або пажадай што-небудзь тым, хто таксама ўдзельнічае або збіраецца ўдзельнічаць у алімпіядах.**

**Віка**: Вучыцеся, вучыцеся і яшчэ раз вучыцеся! Бо тое, як вы вучыцеся, ужо зараз уплывае на вашы вынікі ў будучыні. Таксама не бойцеся рабіць памылкі, бо яны даюць стымул развівацца далей!

*Гутарыла і запісала Кацярына Губчэўская*

# На шляху нечаканых адкрыццяў



**Няспешна ўзіраюся ў старыя вуліцы вёскі Жорнаўка, дзе я нарадзілася і жыву, вуліцы і завулкі горада Беразіно, дзе я вучуся, і адчуваю, як дбайна клапоцяцца гаспадары пра ўласныя хаты. Прыгожа пафарбаваныя, прыбраныя старыя драўляныя суседнічаюць з такімі ж памаладзеўшымі сяброўкамі – хатамі, абшытымі сайдынгам ды металапрофілем. Што ж, змяняецца час, змяняемся мы, людзі, новы воблік атрымоўваюць хаты, аздабляюцца, прыгажэюць. Аднак пры гэтым мяне не пакідае адчуванне, што за сучасным выглядам страчваецца нешта сваё беларускае, адметнае…**

Што вы лічыце помнікам архітэктуры ў нашым горадзе? – з такім пытаннем я звярнулася да сваіх аднагодкаў. Большасць апытуемых даволі ўпэўнена назвала дом графоў Патоцкіх. Сапраўды, гэта найбольш вядомы архітэктурны помнік Беразіно, яго культурна-гістарычная разынка. Узнікненне сядзібна-паркавага комплексу звязваюць з імем Ганны Патоцкай-Вансовіч (у дзяв. Скумін-Тышкевіч) – унучатай пляменніцай апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, прадстаўніцай магутнага роду Патоцкіх, якая пакінула досыць цікавыя мемуары пра сябе, высокі свет, вядомых дзеячоў свайго часу Александра І, Напалеона, Т.Касцюшку. На жаль, за апошнія 40 гадоў помнік архітэктуры апынуўся ў аварыйным стане. Пакінуты і занядбаны, ён панура глядзіць на нас праз стагоддзі. Што адкажам мы яму, што зробім дзеля таго, каб захаваць?! У мінулым годзе дзве нашы школьныя даследчыя працы, прысвечаныя сядзібна-паркаваму комплексу, атрымалі 3 дыпломы абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Вынікам адной з прац стала гульня, дзякуючы якой кожны жадаючы можа выразаць з паперы і склеіць макет сядзібы. Гэта быў добры, удалы захад для захавання памяці пра мінулыя часы, цудоўная спроба абудзіць цікавасць дзяцей і падлеткаў да гісторыі роднага краю ў гульнёвай форме.



А вось сваім пытаннем “Ці лічыце вы звычайную драўляную хату архітэктурнай адметнасцю часу?” я найбольш уражвала і здзіўляла апытуемых, большасць з якіх упэўнена адказвала “Не”. Шкада… Вам, старыя драўляныя і на новы лад перабробленыя хаткі, вынеслі прысуд. Несправядлівы і горкі. А можа, мала, сябры, ведаеце вы родны край? – хацелася мне запытацца.

Яшчэ ў старажытнасці ў часы язычніцтва ў нашых продкаў складваецца ўяўленне аб пабудове хаты як пэўнай сімвалічнай мадэлі сусвету. У хаце, як і ў храме, існаваў дакладны парадак. Кожнае яе акно, куточак, печ, парог, прадметы мэблі мелі сваё непаўторнае прызначэнне. Напрыклад, тры асноўныя ўзроўні хаты (дах, жылая частка і пограб) суадносіліся з трыма сферамі пабудовы свету: вышэйшая сфера – язычніцкі пантэон багоў, сярэдні ярус належыць чалавеку і жывёльнаму свету, а ніжні насяляюць хтанічныя істоты і продкі. На жаль, пры рамонце зашываюцца акенцы ці адтуліны ў форме розных геаметрычных фігур, якія знаходзяцца непасрэдна на трэцім узроўні. Яны ж даюць святло багам і самі сімвалізуць нябеснае святло. Іх знікненне – гэта парушэнне гармоніі светабудовы…

Памятайце гэта: свет вакол нас цікавы сваімі адметнасцямі, дробязямі, з якіх складаецца цэлае. Адчуйце гэта, і, магчыма, ваша ўяўленне пра свет і людзей будзе больш поўным. Даследуйце, вывучайце, вырывайцеся па-за межы звыклай абыдзеннасці да спазнання дзівоснага свету і новых адкрыццяў на шляху неспазнанага.

***Даследуе і вывучае гісторыю роднага краю Анастасія Бурая***

*Дом, у якім утульна ўсім!*
berezino2.school.by *№ 5 (61) студзень 2020 г.*

# Мабільныя тэлефоны ў школе пад забаронай



**Згодна з Правіламі ўнутранага распарадку для вучняў нашай установы адукацыі (пазнаёміцца з імі можна на нашым школьным сайце) катэгарычна забараняецца карыстацца прыладамі мабільнай сувязі, інтэрнэт-сувязі, музыкальнымі калонкамі, гульнявымі прыладамі ў час адукацыйнага працэса без дазволу педагогаў. Акрамя таго, катэгарычна забаронена праводзіць здымкі ў час правядзення вучэбных заняткаў, класных газін, пазашкольных мерапрыемстваў без дазволу кіраўнітцва ўстановы адукацыі, класнага кіраўніка, настаўніка-прадметніка.**

Сотавая сувязь дае людзям магчымасць гутарыць, абменьвацца інфармацыяй, знаходзячыся практычна ў любым пункце свету.

Адной з самых галоўных прычын, па якой бацькі купляюць дзецям мабільныя тэлефоны, – магчымасць трымаць на кантролі, дзе знаходзіцца любімае дзіця, даведацца, чым займаецца і калі будзе дома.

Даказана, што злоўжыванне мабільнымі тэлефонамі наносіць шкоду здароўю чалавека і выклікае галаўныя болі, дрымоту, раздражняльнасць, боль і рэзь у вачах, пагаршэнне зроку, можа спрыяць узнікненню анкалагічных захворванняў.




Як паказвае статыстыка, з-за смартфонаў людзі менш рухаюцца. Гэта прывяло да таго, што павялічалася колькасць людзей з лішняй вагой цела, а сярэдні паказчык вагі павялічыўся на 10 кг.

Акрамя таго, мабільныя тэлефоны з'яўляюцца разносчыкамі бактэрый. Задумайцеся! Колькі разоў на дзень вы вымылі рукі, а працёрлі вільготнай сурвэткай тэлефон?!

Вучням цяжка пагадзіцца з забаронай карыстацца мабільнымі тэлефонамі ў час школьных заняткаў. Між тым, не трэба забывацца пра існуючыя Правілы.

Аднак наколькі б страшнай не была пагроза парушыць правілы, рукі вучняў усё роўна свярбяць залезці ў кішэню, дастаць тэлефон і пагуляць у яго.

**Прапаную некалькі слушных парад** для тых, хто не выпускае мабільнага тэлефона ў школе: **старайцеся пакідаць тэлефон дома. Калі ж ўзялі яго ў школу, не забывайце выключыць гук і пакласці ў ранец.**

*Матэрыял падрыхтавала*
*Анастасія Бурая*

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by** *№ 5 (61) студзень 2020 г.*

# У полі зроку: ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ



**Факультатыўныя заняткі “Уводзіны ў педагагічную прафесію”, якія я з цікавасцю наведваю, даюць мне магчымасць свядома падысці да выбару будучай прафесіі настаўніка, а таксама бліжэй пазнаёміцца з асаблівасцямі працы педагога, паспрабаваць сябе ў гэтай ролі.**




Запэўніла мяне ў правільнасці свайго выбару і сустрэча-размова з былой вучаніцай установы Наталляй Галуза, якая завітала ў канцы студзеня ў нашу цудоўную школу. Зараз дзяўчына з’яўляецца студэнткай Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова.

Наталля здаўна марыла быць настаўніцай пачатковых класаў, у старшых класах наведвала дадаткова факультатыўныя заняткі. У час сустрэчы яна расказала пра вучобу, прахадныя балы, актыўнае студэнцкае жыццё (цікавыя мерапрыемствы: конкурсы, канцэрты, творчыя праекты, экскурсійныя паездкі), а таксама пра жыццё ў інтэрнаце і інш.

У час сустрэчы наша госця акцэнтавала ўвагу на тым, што прафесія настаўніка заўсёды былі і застанецца запатрабаванай. З лёгкасцю пагаджуся з яе меркаваннем. Настаўнік – трывалы стрыжань грамадства. Ён перадае веды новым пакаленням, выхоўвае сваіх вучняў і фарміруе іх як асобу. У сілах гэтага спецыяліста адкрыць здольнасці ў вучня і накіраваць яго на шлях удасканальвання.



Таксама ў студзені мы з задавальненнем наведалі заняткі настаўніцы пачатковых класаў І.У.Шаграй.

Тут мы змаглі ўбачыць урок не вачыма вучня, а будучага настаўніка, даведацца пра метады і прыёмы навучання, уменне
ствараць на ўроку добразычлівую атмасферу, калі пануе цудоўны настрой, вучні актыўна ўключаны ў адукацыйны працэс і ёсць вынікі працы.

Варта адзначыць, што калі мае далейшыя крокі ў будучым, звязаныя з набыццём прафесіі, атрымалі акрэслены выгляд, то некаторыя выпускнікі яшчэ сумняваюцца, выбіраюць. Спецыяльна для іх дзейнічае тэматычная выстава ў нашай школе. Таксама карысную інфармацыю пра дні адкрытых дзвярэй у розных навучальных установах можна атрымаць на нашым школьным сайце. Няхай ваш выбар будзе ўдалым!

Поспехаў, выпускнікі!

***Наталля Пянкрат,***
***вучаніца***
***11 “А” класа***

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by** ***№ 5 (61) студзень 2020 г.***

# Глушэц абраны птушкай 2020 года!



**Птушку года абвясцілі ў час фестывалю IBB JubiläumsFest, прысвечанага 25-годдзю Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханэса Рау (IBB Мінск). Сустракайце глушца!**

Глушэц — гняздуючы аселы від з атраду курападобных. Распаўсюджаны вельмі нераўнамерна па ўсёй тэрыторыі Беларусі, але часцей сустракаецца ў паўночных раёнах і на ўсходзе. Ацэнка колькасці 8000 – 9000 асобін. Гэта таёжны, паўночны від і ў сувязі са зменай клімату ён паступова паўсюль па Беларусі знікае. Асабліва катастрафічнае становішча цяпер на захадзе і поўдні краіны – у Белавежскай пушчы сто гадоў назад жылі сотні глушцоў, а цяпер ён тут амаль знік.

У Беларусі жывуць два падвіды глушца: заходнееўрапейскі і сярэднярускі. У заходнееўрапейскага падвіду ёсць характэрны элемент «корак» (“пробка”), таксама чорнае бруха амаль не мае белых плям, і ён больш буйны, чым усходняя раса. На жаль, колькасць заходнееўрапейскага падвіду нізкая: не перавышае 500 асобін.

Самец глушца памерам з хатняга індыка і лёгка адрозніваецца ад іншых курыных буйнымі памерамі. Самцы добра адрозніваюцца ад самак бліскучай чорна-зялёнай расфарбоўкай. Самка меншага памеру і афарбаваная пад колер лісцяў і зямлі. Такая афарбоўка асабліва патрэбная ёй для маскіроўкі ў час наседжвання яек.

Глушэц – патрыёт, амаль усё жыццё можа пражыць у адным лесе. Гэтыя птушкі жывуць і гняздуюцца ў хвойных лясах паблізу моховых балотаў. Увесну і ўлетку глушэц выкарыстоўвае ў ежу парасткі, кветкі, пупышкі, лісце, лясныя ягады, насенне і насякомых. Увосень птушкі кормяцца лісцем асін, ягадамі журавін, зімой – хваёвай ігліцай, пупышкамі. Птушанятам патрэбны бялок, таму яны ўжываюць у ежу у асноўным казурак і павукоў.

**Сямён Левы**, спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях:

*“У большасці месцаў рассялення ў нас глушэц — рэдкі від. Галоўныя пагрозы яму — знікненне месцаў пражывання з-за высечкі лесу на месцах такавання птушак, падсочка (здабыча) птушкі на таках і каля іх, турбаванне ў гнездавы перыяд, паляванне на самцоў на невялікіх такавішчах, прэсінг з боку драпежнікаў (у тым ліку інтрадукаванага янотападобнага сабакі) і канкурэнцыя капытных жывёл”.*

***Даведка.*** Нацыянальную кампанію “Птушка года” АПБ праводзіць з 2000 года, каб прыцягнуць увагу людзей да дзікіх птушак Беларусі, іх праблем і неабходнасці захавання тых месцаў, дзе яны жывуць. Увесь 2020 год будуць праходзіць мерапрыемствы, прысвечаныя глушцу, да якіх змогуць далучыцца дарослыя і дзеці.



У мінулыя гады сімваламі Беларусі былі: белы бусел, белая пліска, авяльга, дамавы верабей, гарадская ластаўка, барадатая кугакаўка, кнігаўка, салавей, вялікая белая чапля, шэры гусь, сокал-пустэльга, вялікі кулён, чорны свіргуль, удод, звычайная зязюля, вушатая сава, жаўрук-смяцюх, шчыгол, вялікі арлец.

Даведацца больш падрабязна пра дзейнасць грамадскай арганізацыі “Ахова птушак Бацькаўшчыны” можна на сайце ўстановы https://ptushki.org/

*Матэрыял і фота з сайта арганізацыі*

# Каляндар знамянальных і памятных дат

## Студзень

**15** Дзень нараджэння Вікіпедыі
**19** Дзень выратавальніка Беларусі
**25** Дзень студэнта (Таццянін дзень)
**26** Дзень беларускай навукі
**26** Міжнародны дзень БЕЗ інтэрнэта
**27** Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста
**28 – 80 гадоў** з дня нараджэння Леаніда Дайнэкі, беларускага пісьменніка, аўтара рамана «Меч князя Вячкі»
**4** – **75 год** з часу выдання газеты «Зорька»
**15 – 170 год** з дня нараджэння Сафіі Кавалеўскай, матэматыка, першай жанчыны члена-карэспандэнта Пецярбургскай Акадэміі навук
**15 – 225 год** з дня нараджэння Аляксандра Грыбаедава, рускага пісьменніка, дыпламата, аўтара «Горе от ума»
**19 – 155 гадоў** з дня нараджэння Валянціна Сярова, рускага мастака, аўтара знакамітай карціны “Девочка с персиками”
**29 – 160 гадоў** з дня нараджэння Антона Паўлавіча Чэхава, рускага пісьменніка

## Люты

**8** Дзень юнага героя-антыфашыста
**13** Дзень радыё
**14** Дзень святога Валянціна, альбо Дзень усіх закаханых
**14** Дзень камп'ютаршчыка
**15** Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў Беларусі
**17** Дзень спантаннай праявы Дабрыні
**21** Міжнародны дзень роднай мовы
**23** Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь
**10 – 130 гадоў** з дня нараджэння Барыса Пастарнака, аўтара рамана «Доктар Жывага»
**14** – **220 гадоў** з дня нараджэння Валенція Вільгельма Ваньковіча, ураджэнца Бярэзінскага раёна, жывапісца, аднаго з найбольш значных беларускіх мастакоў XIX ст.
**19 – 75 гадоў** з дня нараджэння Юрыя Антонава, спявака, кампазітара
**22** – **210 гадоў** з дня нараджэння Фрэдэрыка Шапэна, польскага кампазітара і піяніста
**24 – 85 гадоў** з дня нараджэння Рыгора Барадуліна, народнага паэта Беларусі

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by** *№ 5 (61) студзень 2020 г.*

# Самыя яркія падзеі студзеня ў 4 "А" класе (кл. кір. І.У.Шаграй)





**Святочнае мерапрыемства "Эх, калядачкі"**



**Экскурсія на кандытарскую фабрыку "Камунарка"**



**Упэўненыя, вам таксама ёсць чым падзяліцца на старонках нашай газеты. Дасылайце свае фотаздымкі!**

ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст": Бурая Анастасія, Губчэўская Кацярына, Лукашэвіч-Рыбачонак Лізавета, Морская Яна, Рафальская Аляксандра, Радзевіч Аліна і інш.